ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМСАМОЛЬСКАГА І ПРАФСАЮЗНЫХ КАМІТЭТАЎ БЕЛАРУСКАГА ОРДЭНА ПРАЦОЎНАГА ЧЫРВОНАГА СЦЯГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ У. І. ЛЕНІНА

ГАЗЕТА УЗНАГАРОДЖАНА ГАНАРОВАЙ ГРАМАТАЙ ВЯРХОЎНАГА САВЕТА БССР

1986
6
ЛІСТАПАДА
ЧАЦВЕР
№ 28 (1514)

ВЫДАЕЦЦА З 1922 ГОДА

Беларускі універсітэт
## ТЭЛЕТАЙП
*ЎЧОРА • СЁННЯ • ЗАЎТРА*

### Студэнцкі інтэрфестываль

прысвячаецца міжнароднаму Дню студэнта і 40-годдзю Міжнароднага саюза студэнтаў. Ён адбудзецца ў Палацы Белсаўпрофа 16 лістапада. У яго праграме: мітынг-канцэрт, антываенны рэферэндум «Час дзейнічаць», віктарына, мультькалаж, гульні і, зразумела, танцы. Білеты можна набыць у 306-м пакоі камітэта камсамола.

А. САМУЙЛІЧ.

### «Музычная восень»

не пакінула без увагі і мастацкія калектывы універсітэта, у якіх зараз вельмі насычанае жыццё: канцэрты, паездкі, выступленні... Так, агітбрыгада наведала калгас «За мір» Стаўбцоўскага раёна, а народны тэатр-студыя выступіў у Уздзенскім раёне са спектаклем па А. Чэхаву «Юбілей». Гасцей праводзілі шчырымі словамі падзякі.

М. ТАРАСАВА.

### Прыём

у камітэце камсамола БДУ кіраўнікоў універсітэцкіх маладзёжных арганізацый саюзаў моладзі быў прысвечаны дню нараджэння камсамола. На ім выступілі А. Самуйліч, намеснік сакратара камітэта камсамола па інтэрнацыянальнай рабоце, кіраўнік універсітэцкай арганізацыі ССНМ Эвелін Зандлас. Адбылася змястоўная гутарка аб паляпшэнні супрацоўніцтва паміж камітэтам камсамола і саюзамі моладзі замежных студэнтаў.

А. САЎЧЫК.

### Новы этап

пачаўся ў дзейнасці прафсаюзнага камітэта студэнтаў. На нядаўняй XXXV справаздачна-выбарнай прафсаюзнай канферэнцыі былі падведзены вынікі працы за 2 гады. На ёй выступілі: са справаздачным дакладам старшыня прафкома студэнтаў А. Д. Кішкевіч, рэктар універсітэта акадэмік АН БССР Л. І. Кісялеўскі, прафоргі А. Каблуха (III курс, ФПМ), В. Сігаловіч (II курс, гістфак), дырэктар студэнцкага клуба У. М. Макарэвіч.

Старшынёй прафкома студэнтаў выбраны А. Д. Кішкевіч, намеснікамі — Н. М. Туромша і П. І. Лапцёнак.

А. СЦЯПАНАЎ.

Няхай жыве 69-я гадавіна Вялікай Кастрычніцкай Сацыялістычнай рэвалюцыі!
Слава Вялікаму Кастрычніку!

(З Заклікаў ЦК КПСС).



НА АТРЫМАННЕ ДЗЯРЖАЎНАЙ ПРЭМІІ БССР

## СПАСЦІГАЮЧЫ АСОБУ ПАЭТА

**Творчасці класіка беларускай літаратуры Янкі Купалы ў сучасным літаратуразнаўстве прысвечаны шэраг даследаванняў, манаграфій, аўтары якіх звяртаюцца і да жыццёвага шляху паэта. Але па-сапраўднаму навуковай біяграфіі, з усебаковым і сістэматычным асвятленнем асноўных вех жыцця песняра, іх навуковым і мастацкім выяўленнем у беларускай літаратурнай навуцы да сённяшняга часу не было. Вось чаму з такой цікавасцю сустрэта чытачамі першая спроба мастацкай біяграфіі пісьменніка, напісаная вядомым беларускім паэтам і вучоным Алегам Лойкам.**

КНІГА А. Лойкі «Як агонь, як вада...» мае падзагаловак «Раман-эсэ пра Янку Купалу». Аўтару сапраўды ўдалося на аснове асэнсавання строга выверанах навуковых фактаў стварыць арыгінальны мастацкі твор, дзе канкрэтныя падзеі, гістарычныя рэаліі і аўтарская фантазія выяўляюцца ў маштабе рамана-біяграфіі.

Аўтар кнігі ставіць сабе за мэту на аснове архіўных дакументаў, успамінаў сучаснікаў, аўтабіяграфічных момантаў у творах пісьменніка паказаць непаўторную, велічна-значную асобу Янкі Купалы, яго творчы подзвіг, адказаць на галоўнае пытанне: як, у выніку чаго, дзякуючы якім унутраным матывам, імпульсам і ўплывам прадстаўнік дробнапамеснай шляхты вырас у вялікага нацыянальнага паэта, трыбуна беларускага слова, «песняра рэвалюцыйнай радасці». У цэнтры ўвагі аўтара — духоўны рост, эвалюцыя светапогляду пісьменніка.

Вобраз паэта ў кнізе пададзены ў цесным акружэнні рэальных гістарычных асоб, якія адыгралі пэўную ролю ў жыццёвым лёсе Янкі Купалы. Абмалёўка гэтых персанажаў (У. Самойла, Б. Эпімах-Шыпіла, Я. Колас, П. Мядзёлка і інш.) даследчыкам таксама навукова выверана і па-мастацку асэнсавана. Там, дзе гаворка ідзе пра людзей, аб дзейнасці якіх аўтар не меў грунтоўнага фактычнага матэрыялу, дапушчана значная ступень гіпатэтычнасці, персанажы дзейнічаюць у творы пад змененымі прозвішчамі, за якімі, праўда, лёгка ўгадваюцца сапраўдныя (Антон і Іван Лапкевічы, Вацлаў Ласоўскі і інш.). Даследчык у даным выпадку ідзе па шляху імавернасці, праўдападобнасці, інтуітыўнага асэнсавання рэчаіснасці.

Мастацкая біяграфія Янкі Купалы, напісаная А. Лойкам, атрымалася ў сапраўдным сэнсе слова навуковай і чалавеказнаўчай, змагла раскрыць і паказаць глыбіню чалавечай натуры вялікага паэта. Яна дорыць радасць далучэння да жыцця і творчасці вядомага пісьменніка ўсім, каго зацікавіць гэта кніга.

Т. КАВАЛЕНКА,
выкладчык.

## ГРАМАДАЗНАЎЦЫ Ў ПОШУКУ

ПЕРАБУДОВА ВНУ: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

**Устаноўкі XXVII з'езда КПСС, якія вызначаюць задачы развіцця грамадскіх навук, арыентуюць не толькі нашу даследчую работу, але і вызначаюць стратэгію выкладання сацыяльна-эканамічных дысцыплін.**

**Паспяховае вырашэнне ўсіх гэтых задач патрабуе значнага павышэння нашага прафесійнага майстэрства, адмаўлення ад шэрагу стэрэатыпаў у падыходзе да падрыхтоўкі грамадазнаўчых кадраў.**

СІСТЭМА безупыннай адукацыі датычыць не толькі маладых людзей, якіх будуць выпускаць нашы ВНУ, але і нас саміх, выкладчыкаў. Прынамсі, нас у першую чаргу, таму што, чытаючы лекцыі і праводзячы семінарскія заняткі, мы не толькі даём веды студэнтам, але і дэманструем адносіны да сваёй прафесіі, прапануем (жадаем таго ці не) узоры выкладчыцкай дзейнасці, якія студэнты засвойваюць. І калі гэта дрэнныя ўзоры, то негатыўныя сацыяльныя вынікі непазбежныя, прычым яны закранаюць не толькі галіну навучання, але і галіну маральнага выхавання.

Наша прафесійная падрыхтоўка ўключае шмат складаемых. Яна мае на ўвазе перакананасць, ідэйнасць, сацыяльную актыўнасць, спецыяльныя веды, эрудыцыю, педагагічнае майстэрства. У асобнасці кожнае з пералічаных складаемых не з'яўляецца дастатковым, хаця і з'яўляецца неабходным.

Толькі ў сукупнасці яны выступаюць асновай для ацэнкі і нас як спецыялістаў, і якасці нашай працы. Такая справа ў ідэале. Аднак на практыцы нярэдка сустракаюцца даволі моцныя адхіленні ад гэтага. Часта прагалы ў эрудыцыі, агульнай культуры, спецыяльных ведах, педагагічным майстэрстве разглядаюцца як нешта такое, што можа быць кампенсавана, напрыклад, актыўным удзелам выкладчыка ў грамадскай рабоце, добрымі анкетнымі данымі і г. д.

Праверaная жыццём формула: кадры падбіраюцца па палітычных і дзелавых якасцях — не павінна дэфармавацца такім чынам, што дзелавыя якасці трактуюцца як нешта другараднае і не звязанае з палітычнымі. Адсутнасць кампетэнтнасці і прафесіяналізму на этапе паскарэння паварочваецца тымі негатыўнымі з'явамі «падстройвання» пад перабудову, якія рашуча крытыкуе партыя.

Выхад на новы ўзровень прафесійнага майстэрства грамадазнаўцаў мяркуе павышэнне патрабавальнасці на кожнай кафедры. Без змен у працы гэтага звяна ніякіх рэальных зрухаў не адбудзецца.

Неабходны прафесійны рост кадраў і безупыннае саманавучанне ў многім дасягаецца праз сувязь выкладчыцкай дзейнасці з навуковымі даследаваннямі. Прынцып гэты вядомы. Але важна, як ён рэалізуецца на практыцы. Актуальнасць тэматыкі сама па сабе яшчэ не гарантуе поспеху. Напэўна ўсе кафедры ўжо сфармулявалі тэматыку даследаванняў та[illegible] яна адпавядае ўстаноўкам XXVII з'езда КПСС. Але каб атрымаць вынікі, якія ад нас патрабуюцца, неабходна вельмі напружаная праца. Важна, каб на кафедры

(Заканчэнне на 3-й стар.).

# Першы крок — ён цяжкі самы

ПРАКТЫКА





*ПЕДАГАГІЧНАЯ ПРАКТЫКА, як гавораць самі студэнты, якія вырашылі прысвяціць свой лёс нялёгкай справе настаўніка, — адзін з самых цікавейшых і адказных перыядаў за час навучання ў БДУ. Усю першую чвэрць студэнты V курса філалагічнага факультэта беларускага і рускага аддзяленняў наведваюць школу.*

*Першы месяц ідзе адаптацыя: студэнты прыходзяць на ўрокі, бліжэй знаёмяцца з класам, класным кіраўніцтвам. Гэта так званая «пасіўная» практыка.*

*На другі месяц яны замест агульнага сшытка для нататкаў бяруць у рукі класны журнал і з хваляваннем пачынаюць па-сапраўднаму весці свае першыя ўрокі. Акрамя таго, на другім этапе «актыўнай» практыкі студэнтам-практыкантам даручаецца і класнае кіраўніцтва. Ад таго, як справяцца практыканты з роляй выкладчыка, і залежыць адзнака за яе выкананне.*

*«Выдатна» атрымалі за практыку Людміла Касач і Франц Шумчык. Маладыя людзі ўпэўнены ў сваіх сілах, будучая прафесія ім па душы, расчараванні не закранулі іх. Задаволены сваімі падапечнымі кіраўнікі практыкі ў сярэдняй школе № 4 г. Мінска Міхаіл Іосіфавіч Сыракваш і Вольга Васільеўна Казлова.*

*Фота Г. ЮРЧАНКІ.*



ТВОЙ ВОЛЬНЫ ЧАС — ТВАЁ БАГАЦЦЕ

# «Верасень» — круглы год

**Што такое «Верасень?» Чую ў адказ, што гэта — першы месяц восені. Так. Але на юрыдычным факультэце адказ дапоўняць: гэта яшчэ і наш студклуб!**

ВОЛЬНАМУ ЧАСУ моладзі заўсёды надаецца пільная ўвага. Што і казаць, пытанне гэта вельмі важнае і складанае. Асноўная частка работы ў гэтым напрамку ляжыць на камітэтах камсамола факультэтаў і іх падраздзяленнях. Немалую ролю ў паспяховым выкананні іменна гэтай задачы адыгрывае выбар правільных форм культурна-масавай работы. Адной з такіх з'яўляюцца клубы па інтарэсах, стварэнне якіх неаднаразова рэкамендавалася ў дакументах партыі і ўрада. Ды і само жыццё пацвердзіла неабходнасць і жыццяздольнасць такіх самадзейных арганізацый. На факультэтах універсітэта такія аб'яднанні па інтарэсах існуюць у якасці студэнцкіх клубаў. Адзін з іх — клуб «Верасень» юрыдычнага факультэта.

Наш клуб існуе сёмы год. Спачатку гэта была даволі невялічкая група энтузіястаў, у якіх не было ні свайго памяшкання, ні свайго прафесіянальнага кіраўніка, ні тэхнічнага абсталявання. Сёння клуб налічвае больш як 60 чалавек. У ім эстрадны тэатр, драматычны калектыў, цікава праводзіць свае эксперыменты дыскатэка «Эксперымент», плённа працуе агітбрыгада «Час і мы», ажывілася работа турысцкай секцыі...

Мінулы год быў вельмі ўдалым у творчай біяграфіі клуба. Упершыню былі праведзены Дні юрыдычнага факультэта, якія, безумоўна, запомніліся многім, вечар выпускніка, урачыстае закрыццё сезона, конкурсы.

Калектыў даказаў, што яму вельмі многае па плячы. Як вынік — IV месца юрыдычнага факультэта ў міжфакультэцкім аглядзе-конкурсе мастацкай самадзейнасці 1986 года.

Але ўсё гэта прыйшло не адразу, не раптам. Шлях да поспехаў быў вельмі і вельмі няпросты. Пачыналі з памылак, перашкаджалі нам выпадковыя людзі. Прыходзілася развітвацца з імі, бо прыходзілі яны ў клуб «павесяліцца» ці проста «убіць» час.

Вельмі сур'ёзную ўвагу і самае галоўнае — падтрымку аказалі нам камітэт камсамола, дэканат факультэта, партбюро. Нам ішлі насустрач, і такі давер проста нельга было не апраўдаць.

Новы вучэбны год — гэта заўсёды новыя надзеі, новыя сустрэчы і... старыя праблемы. З году ў год вострым застаецца пытанне памяшкання. Кожны раз, калі трэба правесці які-небудзь вечар, КВЗ ці проста дыскатэку — для гэтага патрабуецца час, сілы, каб адшукаць якое-небудзь памяшканне. Але нават якое-небудзь — дарма не абыходзіцца, і тады мерапрыемствы ператвараюцца ў платныя. Так, вартасць фае кінатэатра «Піянер» з 19.00 да 23.00 — 400 рублёў. А ці трэба студэнтам, каб іх вечары былі платныя?

Іншае пытанне, не менш вострае — дзе знайсці прафесіянальнага кіраўніка, бо, згадзіцеся, юрыдычная спецыялізацыя даволі далёкая ад культурна-масавай. Неабходны кіраўнік з прафесіянальнай адукацыяй. Але, як правіла, ім працаваць у нас бясплатна нецікава.

Хацелася б пабольш творчай актыўнасці сярод выкладчыкаў. На прэс-канферэнцыі са сваімі выкладчыкамі нашы студэнты былі проста здзіўлены — колькі ў іх яшчэ маладога запалу, гумару!

Клуб расчыняе свае дзверы і запрашае ўсіх сваіх новых сяброў. А іх з кожным годам становіцца ўсё больш і больш. Клуб «Верасень» ведаюць і ў МДУ, і ў Кіеўскім універсітэце, і ў Іркуцкім політэхнічным інстытуце. Дарога перад «верасънёўцамі» адкрыта. У добры шлях!

А. ВЕТРАВА.

# СЯМЁРКА АДВАЖНЫХ

ТАК ТРЫМАЦЬ!

**...Асаблівых сакрэтаў у іх не было. Ні ад каго. Ні тады, калі студэнцкая рэдакцыя ў шматтыражнай газеце «Горизонт» яшчэ толькі фарміравалася, ні ў той час, калі яна ўжо дзейнічала. Удзельнікам мог быць кожны студэнт факультэта журналістыкі. Пры адзінай умове — гарачым жаданні працаваць. Рабіць памылкі, магчыма, нават расчароўвацца, і зноў — працаваць. На такое не ў кожнага хопіць сіл. Таму я не бачу нічога дзіўнага ў тым, што адбываўся адбор.**

ХТОСЬЦІ спалохаўся цяжкасцей, якіх заўсёды занадта ў кожнай новай справе. Іншыя не змаглі адысці ад шаблону, калі робіцца толькі тое, што ўключае ў сябе праграма практыкі, дзе аб пазапланавай самастойнай творчай працы не гаворыцца ніводнага слова. Трэція... Тыя спачатку згадзіліся. Нават выбралі сабе тэмы для распрацоўкі. Але ў самы апошні момант раптам «прыгадалі», што не жадаюць займацца «дзіцячай» справай.

Засталіся сямёра адважных. Не дзеля трапнага слоўца называю іх так. Не ў павучанне баязліўцам. Проста лічу: каб, зрабіўшы першы крок па шляху нязведанаму, вырашыць ісці далей, трэба мець адвагу. І апантанасць.

Справа вучыла іх быць самастойнымі. Яны і рабіліся такімі. Уражваў абгрунтаванасцю меркаванняў Андрэй Патрэбін. Вераніка Пісарэнка магла гадзінамі весці размову на вытворчыя тэмы, якія яшчэ некалькі месяцаў назад палохалі яе сваёй заблытанасцю і складанасцю.

Справа патрабавала ўважлівых адносін. Не ўсё атрымлівалася ў іх адразу. Засмучана глядзела на белы аркуш Вольга Кісялёва — у каторы раз ужо перапрацоўвала матэрыял, улічваючы заўвагі Аляксандра Крыжаноўскага. Не заўсёды мог адшукаць трапнае слова Саша Гамыляеў — пад шыпенне магнітафона, грукат пішучай машынкі і бурнае абмеркаванне пераваг і недахопаў чарговага матэрыялу дрэнна пісалася. Ціхая і нясмелая, на першы погляд, Наташа Шаранговіч «ваявала» з прафкомам і камітэтам камсамола, здабываючы факты аб рабоце актыву з дапрызыўнай моладдзю.

Я не адзін раз слухала іх апавяданні пра маладзёжны нумар, які члены студэнцкай рэдакцыі вырашылі выпусціць у час практыкі, спадзеючыся толькі на ўласныя сілы. Спрабавала ўявіць сабе іх незвычайную практыку ў звычайнай шматтыражцы. І ўсё ж цяжка было зразумець іх. І вельмі хацелася быць разам з імі.

У шчаслівай сямёркі была справа. Гэтай справай яны жылі. Заставацца, як раней, убаку я не змагла.

ПОЗІРК «ЗНУТРЫ»

ЗНЕШНЕ іх праца па выпуску «свайго» нумара змяшчаецца ў адзін радок: група студэнтаў-практыкантаў — практыка ў газеце «Гарызонт» — выпуск нумара. На самай справе ўсё было ў некалькі разоў складаней. Па дазволу членаў рэдакцыі адкрыю табе, чытач, некалькі невялікіх таямніц.

*Першая. Аптымістычная.* Не, іх справа зусім не паходзіла на дзіцячую гульню, калі глядзяць з паблажлівай усмешкай дарослыя: «Як бы дзіця ні бавілася...». Надта ўсё было сур'ёзна. Ужо з самага пачатку, з рашэння аб стварэнні творчай майстэрні (згадзіцеся, на журфаку без яе не абысціся). Не пажадалі дзяўчаты і хлопцы чакаць, калі хтосьці прынясе яе ў якасці падарунка. Як працавалі? Спачатку ў факультэцкай насценнай газеце. Дарэчы, усе супрацоўнікі «малой» рэдакцыі ўваходзяць у састаў рэдкалегіі «Журналіста». Ён і стаў іх першай школай і першай майстэрняй. Дапамог набываць не толькі тэарэтычныя веды, але і практычныя навыкі.

Да таго ж, уваходзілі ў студэнцкую рэдакцыю энтузіясты, якіх не магла спалохаць бязвыплатная праца. Яны прыйшлі на вытворчае аб'яднанне «Горизонт», каб зведаць усё аб вытворчасці. Не буду сцвярджаць, што ім было лёгка. Нават зусім наадварот. Раней ніхто з іх не пісаў на падобныя тэмы. Таму першы дзень пачынаўся... экскурсіяй. І другі таксама. Здаецца, марнаванне часу. Але гэта не было бесклапотным падарожжам сумуючых турыстаў. Прыкмячалі, шукалі, пыталіся... Адным словам, вучыліся. Жадаеце даведацца аб выніках? Яны ў самім нумары.

Надзейным таварышам была для іх кіраўнік практыкі дацэнт Таццяна Дзмітрыеўна Арлова. Яна адразу бачыла іх самастойнай, у дастатковай ступені дарослай рэдакцыяй. Таму і не спяшалася адразу падказваць, горача падтрымлівала кожную ініцыятыву.

Быў час, калі здавалася, што маладзёжны нумар так і не выйдзе «ў свет». Мабыць, тады і з'явілася тая назва справы — «безнадзейная». Але згадзіцца з гэтым члены рэдакцыі не маглі. І зразумелі: каб справа атрымалася, трэба доўгі час працаваць. Яны і працавалі, забыўшыся на ўсё астатняе. Тым больш, што акрамя маладзёжнага нумара існавала таксама звычайная практыка.

Быў яшчэ адзін чалавек, што дапамог студэнцкай рэдакцыі рабіць сваю справу. Гэта рэдактар «Гарызонта» Юрый Мікалаевіч Гумянюк. Так, спачатку, калі вырашыў узяць на практыку ў шматтыражку ўсіх членаў студэнцкай рэдакцыі, усё ж ён яшчэ не верыў у тое, што маладзёжны нумар атрымаецца. Потым... Разам з імі распрацаваў планы, канкрэтызаваў тэмы.

На гэтым можна было б скончыць размову пра незвычайную практыку, адзначыўшы, што эксперымент атрымаўся. Толькі ёсць яшчэ таямніца.

*Другая. З працягам.* Гавораць, газета жыве толькі адзін дзень. Нумар выйшаў. Маладым «гарызонтаўцам» ён спадабаўся. Бо дапамог вырашэнню многіх праблем.

Але гісторыя аднаго нумара не скончылася. Бо ў кожнай патрэбнай справы абавязкова павінен быць працяг. Хочацца верыць, што будзе ён не толькі на факультэце журналістыкі. Чаму б кожнай групе студэнтаў, што прыходзяць на практыку ў лабараторыю ці на прадпрыемства, не даваць для самастойнай распрацоўкі пэўнай тэмы, канкрэтныя і адказныя справы?

М. ЗАГОРСКАЯ,
наш кар.

ПАЛЕМІЧНЫЯ НАТАТКІ СА СХОДУ ЖЫХАРОЎ ІНТЭРНАТА

# ДЭФІЦЫТ ЖАДАННЯ?

**— Студсавет у нас — арганізацыя фармальная, калі што і робіць, дык дзяжурствы на вахце арганізуе.— Гэта думка аднаго са студэнтаў. Але калі паслухаць старшыню Стаса Міхаловіча — студсавет інтэрната № 2 штогод у ліку лепшых. Парадокс. Ці ж не так? Студэнты ніякай практычнай работы не бачаць, а ў справаздачах значыцца шмат цікавых спраў...**

У ІНТЭРНАЦЕ працавалі спартыўна-масавая і культурна-выхаваўчая камісіі. Дакладчык пералічвае справы... А якую работу бачыў студэнт? І наогул, ці ведаў ён аб існаванні гэтых камісій?

Спартыўна-масавая камісія завочна пад сваю апеку ўзяла тых, хто не супраць пагуляць у футбол, шахматы ці шашкі. Спартсмены ад сваіх апекуноў на працягу года ніякай дапамогі так і не дачакаліся. Што гаварыць, калі нават спартыўны пакой для заняткаў адкрываўся зрэдку, ды і то ён быў зусім непрыстасаваны.

Культурна-бытавая камісія прапанавала сустрэчы з цікавымі людзьмі. Хоць і рэдка яны бывалі, але зноў жа, на жаль, пры амаль пустой зале.

Чым можна растлумачыць такое нежаданне студэнтаў адарвацца на нейкую гадзіну ад спраў і прыйсці пагутарыць, напрыклад, з Паўлам Якубовічам?

— Дрэнна інфармуюць,— скажаце вы,— не ведалі.

З гэтым можна згадзіцца. Дрэнна працуе радыёвузел, рэдкалегія. Аб'явы з'яўляюцца надта позна. На сходзе прапанавалі: радыёвузел павінен перадаваць не толькі музычныя пажаданні. Але, як паказвае час, прапанова прапановай і застанецца.

— Чым яшчэ можна заняцца жыхару інтэрната ў вольны час?

— Да вашых паслуг пакой тэхнічнай творчасці,— на пытанне адказвае старшыня студэнцкага органа самакіравання.

Вы там былі? Калі не — зазірніце. Выдатная магчымасць зрабіць якасны запіс на магнітафонную стужку: ніхто не надакучыць. А калі падумаеце прыйсці што змайстраваць — калі ласка, са сваімі інструментамі.

Што ні кажыце, надта ж балючае гэтае пытанне — правядзенне вольнага часу. Тыя ж дыскатэкі. Прапанову студсавета (адну з нямногіх за час яго работы) аб правядзенні дыскатэк на двух паверхах у чытальных залах — адхілілі.

Вырашылі павялічыць памяшканне на першым паверсе. Згадзіцеся, месца ўсё роўна ўсім жадаючым не хопіць. І яшчэ адна прапанова: танцаваць да гадзіны ночы. У адказ — маўчанне. Ініцыятыва засталася без падтрымкі. А ў студсавета шмат памочнікаў — і дэканаты, і прафком, і камендант. Застаецца ўражанне, што яны са студсаветам у тых жа адносінах, што і спартыўная камісія са сваімі «выхаванцамі». І самае галоўнае: няма ў студэнцкага савета падтрымкі з боку саміх студэнтаў.

— У інтэрнат я прыходжу адпачыць. Тэатр, кіно — там я развейваюся, вучу ў бібліятэцы, а забавы ў інтэрнаце мне не патрэбны.

Можа вашы думкі аналагічныя з думкамі гэтай студэнткі?

Але ж не. Многія жадаюць, каб жыццё ў інтэрнаце не абмяжоўвалася студэнцкім пакоем. Усе схіляюцца да думкі, што няма ў студсавеце ініцыятыўных, зацікаўленых справай людзей, сапраўдных арганізатараў. Прапаную падключыцца, дапамагчы.

— ?!

А згадзіцеся, тая ж арганізацыя работы радыёвузла, выпуск насценгазеты — журналісцкая справа. Шмат спраў знойдзецца для фізікаў, хімікаў.

А каго мы вылучаем у студсавет? На сходзе С. Міхаловіч раздаў спісы кандыдатур. Спісы зачытваюць. Студэнты ўстаюць. Паварочваюцца галовы. Дакладчык зачытвае прозвішчы тых, хто ўвайшоў у новы студсавет. Спіс складзены загадзя. У ім не адзначаны тыя, каго сапраўды прапанавалі, без падказкі старшыні. У зале — смех. Які ж гэта падыход да справы? Дык навошта той сход, калі ўсё даўно вырашылі? Каб атрымаць у знак згоды маўчанне? Абыякавасць?

У зале не раз гучалі словы: работу трэба перабудаваць. Перабудаваць так, каб працавалі не чатыры, а ўсе дваццаць чалавек студэнцкага савета. Каб на такія вось сходы прыходзілі не толькі першакурснікі, якія яшчэ прыкладныя, але і студэнты старэйшых курсаў, каб размова была сапраўды аб справе прынцыповай і дзейснай. Спадзявацца, што ў гэтым годзе ў рабоце студэнцкага савета адбудуцца змены да лепшага? Хто аб гэтым не думае? А калі не толькі спадзявацца? А калі дапамагчы?

В. КАЗЛОВІЧ,
студэнтка факультэта журналістыкі.




# ГРАМАДАЗНАЎЦЫ Ў ПОШУКУ

ПЕРАБУДОВА ВНУ: СТРАТЭГІЯ І ТАКТЫКА ПАСКАРЭННЯ

*(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.).*

склалася рэальнае даследчае «ядро», якое здольна да эўрыстычнага пошуку і можа арганізаваць вакол сябе ўсіх астатніх супрацоўнікаў, аспірантаў і студэнцкую моладзь. Абавязковымі ўмовамі для гэтага з'яўляюцца: аднолькава строгія патрабаванні да ўсіх пры экспертызе і ацэнцы тэкстаў, уключаючы тэксты, напісаныя прафесарамі і самім загадчыкам кафедры; пільны адбор публікацый; рашучая барацьба супраць плагіяту, які яшчэ, на жаль, сустракаецца ў грамадазнаўчых работах; абмеркаванне актуальных праблем, якія знаходзяцца ў стадыі распрацоўкі, ва ўмовах строгіх правілаў навуковай дыскусіі (перад «тварам ісціны» роўныя і прафесар, і аспірант).

Вопыт сведчыць, што фарміраванне адзінай даследчай групы на кафедры — працэс доўгі і цяжкі, але затое ён дае значнае павелічэнне колькасці і рэзкае паляпшэнне якасці навуковай прадукцыі. Натуральным вынікам гэтага працэсу з'яўляецца скачок і ў павышэнні кваліфікацыі кадраў.

Другой важнай крыніцай павышэння прафесійнага майстэрства з'яўляецца ўмацаванне патрабавальнасці пры ацэнцы галоўнага віду выкладчыцкай працы — лекцый і семінарскіх заняткаў.

У матэрыялах XXVII з'езда КПСС падкрэсліваецца, што любое прырашчэнне ведаў мае перадумовай спрэчкі і навуковыя дыскусіі. У святле гэтага палажэння ў сістэме прыёмаў навучання прыярытэтнымі павінны станавіцца «дыялогавыя формы» выкладання вучэбнага матэрыялу, методыкі выкладання, якія фарміруюць у студэнтаў уменне весці дыскусію, навыкі актыўнай пастаноўкі праблем і творчага падыходу да іх вырашэння з пазіцый матэрыялістычнай дыялектыкі. Таму асаблівае значэнне набываюць узоры праблемных лекцый і ўзоры семінарскіх заняткаў, праведзеных па методыцы «малых груп», «круглага стала», «прэс-канферэнцыі» і г. д. Як сведчыць вопыт, гэтыя формы значна павышаюць пазнавальную актыўнасць студэнтаў. А ўмела складзеныя сцэнарыі такіх семінараў могуць стаць добрай асновай для распрацоўкі праграм на ЭВМ, якія выкарыстоўваюцца ў вучэбным працэсе.

У мэтах паляпшэння якасці выкладання і яго далейшай фундаменталізацыі мэтазгодна ўмацаваць узаемадзеянне ўсіх грамадазнаўчых кафедраў. Ад каардынацыі планаў і рабочых праграм належыць перайсці да міжкафедральнага абмеркавання асобных лекцый і семінарскіх заняткаў з пазіцый сучасных патрабаванняў — фарміраваць у студэнтаў сплаў перакананняў, ведаў і навыкаў іх прымянення на практыцы.

Перабудова працэсу выкладання грамадскіх навук немагчыма без значнага павышэння ўзроўню агульнай навуковай эрудыцыі выкладчыкаў-грамадазнаўцаў. Пакуль іх спецыялізацыя вузкая, і многія з іх слаба арыентуюцца ў сучасных дасягненнях навукова-тэхнічнага прагрэсу. Трэба скарэкціраваць падрыхтоўку грамадазнаўцаў і ў цэлым спецыялістаў гуманітарных спецыяльнасцей, улічваючы сучасныя працэсы інтэграцыі грамадскіх, прыродазнаўчых і тэхнічных навук. У аспірантуры належыць прадугледзець выкладанне спецкурсаў па філасофскіх і сацыяльных праблемах сучаснага навукова-тэхнічнага прагрэсу. У ІПК грамадазнаўчага профілю больш увагі патрэбна надаваць вывучэнню асноўных дасягненняў прыродазнаўства і тэхнічных навук, сацыяльных вынікаў навукова-тэхнічнага прагрэсу. Адначасова неабходна прадугледзець цыкл агульнагуманітарных дысцыплін — асноў гісторыі мастацтва, тэорыі і гісторыі культуры і г. д.

У падрыхтоўцы грамадазнаўчых кадраў, як вядома, важную ролю адыгрываюць аддзяленні і факультэты ВНУ, якія рыхтуюць спецыялістаў — філосафаў, палітэканомаў, гісторыкаў партыі. Тут у нас узнікаюць праблемы і з наборам студэнтаў, і з залічэннем найбольш таленавітых і здольных выпускнікоў у аспірантуру. Ёсць вядомая пастанова аб мэтавай падрыхтоўцы спецыялістаў - грамадазнаўцаў. Яна прадугледжвае, што на вучобу належыць накіроўваць пераважна членаў КПСС, якія маюць стаж работы, рэкамендацыю партыйных органаў і паказалі на ўступных экзаменах добры ўзровень ведаў. У наш Беларускі дзяржаўны універсітэт больш паловы «мэтавікаў» на вучобу накіроўваюць з іншых саюзных рэспублік. На жаль, пераважная большасць з іх не задавальняе патрабаванням пастановы, хаця і мае накіраванні ад абкомаў і ЦК саюзных рэспублік. У выніку атрымалася, што калі мы перайшлі на мэтавы метад падрыхтоўкі, конкурс практычна знік, а колькасць камуністаў у студэнцкіх групах паменшылася. Гэта становішча трэба выпраўляць, неабходны конкурс сярод «мэтавікаў». Магчыма, МінВНУ СССР трэба прадугледзець, што пры падрыхтоўцы да мэтавага набору на месцах у экзаменацыйныя камісіі павінен уключацца спецыяліст з той ВНУ, куды будуць накіраваны будучыя студэнты. Пакуль гэтага не робіцца.

Аналагічныя цяжкасці атрымаліся і пры мэтавым камплектаванні аспірантуры па грамадазнаўчых спецыяльнасцях. Залічэнне ў аспірантуру выпускнікоў, выдатнікаў, якія праявілі здольнасць да навуковых даследаванняў, адразу натыкаецца на праблему іх будучага гарантаванага працаўладкавання. Кафедры даюць адпаведнае месца ў аспірантуру толькі тады, калі яна гарантуе наступнае залічэнне аспіранта ў штат. У выніку такой практыкі конкурс сярод аспірантаў амаль адсутнічае. Да таго часу, пакуль не будзе адладжаны «ланцуг» падрыхтоўкі кадраў: «таленавіты студэнт — аспірант — выкладчык — выкладчык вышэйшай кваліфікацыі» мы не зможам здавальняюча вырашаць тыя пытанні кардынальнага паляпшэння падрыхтоўкі грамадазнаўцаў, на якое арыентуе нас стратэгія паскарэння.

Іменна ў бягучай пяцігодцы нам належыць зрабіць рашаючы ўклад у перабудову нашай работы і забяспечыць цесную пераемнасць, пры якой новае пакаленне возьме ад нас лепшыя ўзоры дзейнасці, а негатыўныя бакі і выдаткі непрафесіяналізму знікнуць з патоку трансліруемага сацыяльнага вопыту. Толькі так мы зможам выканаць наказ партыі: творча выкладаць марксісцка-ленінскае вучэнне, якое з'яўляецца вяршыняй чалавечай культуры, згусткам лепшых дасягненняў чалавечай думкі.

В. СЦЕПІН,
загадчык кафедры марксісцка-ленінскай філасофіі гуманітарных факультэтаў, прафесар.

СЛОВА — ПЕРШАКУРСНІКУ

# Як стварыць сапраўдны калектыў

**ІСНУЕ МЕРКАВАННЕ,** што сапраўдны калектыў у першакурснікаў фарміруецца на сельскагаспадарчых работах, на першай «бульбе». Адразу скажу, што з гэтым я не згодзен. На сельгасработах юнакі і дзяўчаты толькі бліжэй знаёмяцца, даведваюцца пра інтарэсы кожнага. Інакш кажучы, становіцца бачна, хто ёсць хто. Але ці можна лічыць калектыў сфарміраваным толькі па гэтых паказчыках? Безумоўна, не.

У саўгасе мы маглі весці агульныя справы ўсім курсам, таму што працавалі ў адным, Уздзенскім раёне, а жылі па розных вёсках: Мрочкі і Віркова. Гэта і ёсць асноўная прычына таго, як лічыць куратар другой групы В. Р. Булацкі, што некаторыя юнакі і дзяўчаты знаходзяцца сёння ў адносінах паміж сабою на ўзроўні яшчэ першага зрокавага знаёмства ўступных экзаменаў. Але гэта адзінкі, і па іх нельга рабіць вывад аб усім курсе. Касцяк, магу цвёрда сказаць, ужо склаўся ў нас. Такія таварышы, як стараста Ігар Касцевіч і камсорг Андрэй Заерка, імкнуцца развіць з яго моцны калектыў студэнтаў.

Звярнуся зноў да работы ў саўгасе. Трэба прызнаць, што не было ў нас там такіх ужо найцікавейшых мерапрыемстваў, пра якія можна доўга памятаць. Мы проста збіраліся вечарамі пасля працы ў адной з хат, пілі чай, спявалі пад гітару, размаўлялі. Для нас гэта было цікава. Галоўнае — мы разам адпачывалі.

Ці вось яшчэ два прыклады. Не выдалі своечасова стыпендыю. І нейкае хваляванне было ва ўсіх. Нехта з вас усміхнецца, маўляў, хто ж не будзе хвалявацца за свае грошы? Але ў тым і справа, што тэрмінам выдачы стыпендыі цікавіліся і тыя, хто яе не атрымлівае. Што гэта, хваляванне за таварыша? Так. Прыемна было даведацца, што інтарэсы таварыша для многіх вышэй за ўласныя. Ці вось яшчэ. Выйшла ў нас фотагазета аб працы ў саўгасе. Нельга, безумоўна, было працаваць над ёй усім. Але Ігар Касцевіч, Саід Ісламі, Сяргей Арлоўскі, Станіслаў Сулкоўскі, якія рабілі газету, адчувалі, як яе чакаюць астатнія. Карацей кажучы, патрэбна яна была не тром-чатыром чалавекам, а ўсім пяцідзесяці, усяму курсу. Як бачым, калектыў складваецца. І яго замацаванне ўжо не за гарамі.

Так, у кожнага свае інтарэсы, свае схільнасці. Ігара Карнея і Ігара Чарткова цікавіць футбол, Эла Саевіч і Слава Мінкоў любяць тэатр, Валя Кунцэвіч і Юра Сабасцян — музыку, а Наташа Каштанава і Ігар Касцевіч добра танцуюць. Але ўсе мы шукаем агульныя інтарэсы і абавязкова знойдзем.

Шмат у нас сёння праблем па станаўленню калектыву. Наперадзе нямала сумесных вечароў, культпаходаў, цікавых спартыўных спаборніцтваў, розных паездак. Мы верым, што калектыў будзе моцным, а стварэнне яго залежыць толькі ад нас саміх.

А. ПУЦІЛА,
студэнт факультэта фурналістыкі.

# КРОС? КРОС... КРОС!

СПАЧАТКУ таксама быў крос, і прымалі ўдзел усе курсы шматлікіх факультэтаў нашага універсітэта. Потым, праз некаторы час, яго змянілі больш простыя спаборніцтвы па бегу сярод студэнтаў толькі першых курсаў. Яны зрабіліся традыцыйнымі і праходзілі паспяхова, мелі папулярнасць. І вось цяпер на змену ім вярнуўся стары забыты крос для ўсіх.

Пачаўся ён неяк таямніча, пад ранішнюю заслону туману, якая схавала на некаторы час поўнае відовішча спаборніцтваў. Радыёфізікам, якія стартавалі першымі, у 10 гадзін, і пашанцавала, і не. Тут, як заўсёды, можна знайсці прыхільнікаў двух супрацьлеглых пунктаў погляду.

Аднак гэта не перашкодзіла выступіць добра тым, хто прыйшоў з жаданнем змагацца. Лепшы вынік (2 мін 40 сек) сярод мужчын у бегу на 1000 м паказаны ў адным з першых стартаў другакурснікам радыёфізічнага факультэта Андрэем Гарбацэвічам. Яго рэзультат пратрымаўся на працягу ўсіх сямі гадзін, пакуль ішлі спаборніцтвы. І гэта таксама своеасаблівы рэкорд, калі ўлічваць, што за ім выступалі прадстаўнікі яшчэ 10 факультэтаў, сярод якіх нямала было добрых спартсменаў. Тым каштоўней медаль, які атрымаў Андрэй Гарбацэвіч, задаўшы сваім рэзультатам добры рытм спаборніцтваў.

У гэты дзень секундамеры не ведалі спакою. Як, мусіць, і самі выступаючыя прадстаўнікі ад розных факультэтаў БДУ імя У. І. Леніна. І не толькі на дыстанцыі аддаваліся ўсе сілы для перамогі. Не менш цікава было назіраць і за чакаючымі свайго старту камандамі. Пакуль сонейка прабівалася скрозь туман, шмат хто адчуваў сябе няўтульна, зябка паводзячы плячыма. Але не здавацца ж на міласць холаду! І яму рашуча аб'явілі аб сваёй нязгодзе ўсе. Загучала музыка, і на вялікім лузе Камсамольскага возера, па суседству з паркам Перамогі, закруціліся шматлікія пары танцуючых. Пасыпаліся жарты, смех...

Спаборніцтвы адзначаны, як адны з самых масавых за апошнія гады. У іх прымала ўдзел 2.400 чалавек. Але трэба прызнаць, што на асобных факультэтах не было належнай арганізацыі. Гэта датычыць радыёфізічнага факультэта, а таксама мехмата і біялагічнага факультэтаў. Зрабі яны так, як аднесліся да справы на ФПМ, дзе выставілі акрамя непасрэдных удзельнікаў яшчэ 100 чалавек замены, і, хто ведае, можа таксама былі б у лідэрах. Вельмі не хапала і прадстаўнікоў з дэканатаў. Як-ніяк, а гэтыя спаборніцтвы нельга зняважліва абыходзіць бокам. Такое праводзіцца не кожны дзень. Не паклапаціліся наогул і аб абслугоўванні спаборніцтваў. А як быў бы дарэчы гарачы чай і булачка! Гэта, згадзіцеся, самыя сціплыя патрабаванні.




Перамога дастаецца дужым і арганізаваным. На гэты раз у камандным заліку яе ўдастоены фізічны факультэт (83,40 ачка). На другім месцы — хімічны факультэт (82,22 ачка), на трэцім — ФПМ (80,71 ачка). Сярод лепшых у мужчын на II месцы Аляксандр Моніч (II курс, юрфак — 2 мін. 47 сек.), на III — Уладзімір Гутар (II курс, фізфак — 2 мін. 48 сек).

У жанчын за першае месца медалём адзначана Ала Булаўка (I курс, юрфак — 1 мін. 25,8 сек), на II — Аксана Ерахавец (II курс, ФПМ — 1 мін. 26,2 сек), на III — Алена Кавалёва (фізфак — 1 мін 27 сек).

У межах гэтых спаборніцтваў прайшлі яшчэ адны: таксама па кросу — сярод вучэбных груп. Тут прызавыя месцы падзялілі такім чынам: I месца — юрфак — 91,5 ачка; II — мехмат — 80,75 ачка; III — ФПМ — 76,08 ачка.

Мы спрачаліся, калі зручней выступаць і ў якім парадку? Што рабіць, каб стаць пераможцам? Увесь ход спаборніцтваў падказаў правільны адказ. Незалежна ад прыведзеных вынікаў на першым месцы заўсёды застануцца масавасць, бадзёрасць, добры настрой ад спартыўнага свята, якое падарыў нам крос.

*А. МАКСІМАЎ,*
*студэнт факультэта журналістыкі.*
*Фотакалаж АЎТАРА.*

ПЫТАЙЦЕСЯ — АДКАЗВАЕМ

# ЗАМЕЖНІК ПАПРАСІЎСЯ НА КВАТЭРУ

ЗАКОН І ТЫ

ЦІ МАЛА па якіх прычынах замежнік (звычайна студэнт нашай ВНУ) можа папрасіць здаць у паднаём кватэру, пакой. Ці ўступіць з вамі ў іншую здзелку. Як паступіць у канкрэтнай сітуацыі? Безумоўна, лепш азнаёміцца з адпаведным нарматыўным актам: Указам Прызідыума Вярхоўнага Савета СССР. Ён так і называецца: «Аб адміністрацыйнай адказнасці службовых асоб і іншых грамадзян за парушэнне належных да іх патрабаванняў, якія змяшчаюцца ў актах заканадаўства СССР, устанаўліваючых правілы знаходжання ў СССР і транзітнага праезду праз тэрыторыю СССР замежных грамадзян і асоб без грамадзянства». Прыняты ён у маі 1984 года. У Кодэксе БССР аб адміністрацыйных правапарушэннях ёсць артыкул 185. Ён падрабязна вызначае віды правапарушэнняў, памеры штрафаў, парадак прымянення.

Супрацоўнікі міліцыі Мінска выяўляюць нямала такіх адступленняў. Найбольш актыўна працуюць пашпартныя аддзяленні Заводскага, Савецкага, Ленінскага і Першамайскага РАУС. Вялікая роля тут адводзіцца участковым інспектарам, работнікам ЖЭС, ЖСК, камендантам інтэрнатаў і іншым адказным асобам.

У чым жа звычайна заключаюцца адхіленні ад закона?

Некаторыя мінчане здаюць жылыя памяшканні ўнаём і паднаём без прапіскі замежнікам, часова пражываючым у СССР і забяспечаным жылой плошчай. Так, Л. Сліўцова без дазволу на прапіску дапусціла пражыванне грамадзяніна Кубы, прыбыўшага з Ленінграда. За гэта яна была прыцягнута да адміністрацыйнай адказнасці.

Артыкул 185 мае і іншую накіраванасць. Гэта барацьба з непрацоўнымі даходамі, якія сёй-той атрымлівае, здаючы ўнаём дзяржаўныя кватэры. Да прыкладу, кіраўнік групы «Белдзяржпраекта» Л. Мілаванава па рэкамендацыі сяброўкі здала жыллё сям'і замежніка і мела з гэтага немалую выгаду. Незаконныя дзеянні Мілаванавай спынілі супрацоўнікі аддзела віз і рэгістрацыі.

Парушэнні артыкула 185 могуць у далейшым спрыяць умовам для іншых незаконных дзеянняў. Указаныя кватэры, як правіла, замежныя студэнты выкарыстоўваюць не па прызначэнню. Там здзяйсняюцца п'янкі, спекулятыўныя здзелкі, укрывальніцтва розных злачынных элементаў.

Такія парушэнні супрацоўнікі міліцыі спынілі ў кватэры па вуліцы Каліноўскага (яе прадаставіла В. Бурачэнка), а таксама у кватэры па вуліцы В. Харужай. Па праспекту «Праўды» жыў без прапіскі, ухіляўся ад выезду на радзіму студэнт з В'етнама. Яго адлічылі з інстытута замежных моў — замест вучобы ён займаўся прыватным пашывам джынсаў і дробнай спекуляцыяй.

Адказнасць па артыкулу 185 наступае таксама тады, калі кватэранаймальнік не прымае мер да своечасовай прапіскі прыбыўшага да яго госця з-за мяжы. Пры такіх правапарушэннях у арганізацыях, інтэрнатах адказнасць нясуць службовыя асобы. За гэта прадугледжаны штраф да 100 рублёў.

За пражыванне ў інтэрнаце № 13 БПІ без прапіскі і дазволу грамадзянкі Перу, прыбыўшай з Пяцігорска, прыцягнута да адказнасці камендант З. Лаханская. У адпаведнасці з гэтым жа артыкулам атрымалі спагнанне начальнік ЖЭС-48 П. Ждановіч, намеснік дырэктара па кадрах Радашковіцкага керамічнага завода В. Рынейскі і іншыя.

Няведанне не вызваляе ад адказнасці. Таму службовым асобам арганізацый, усім грамадзянам неабходна памятаць і строга выконваць патрабаванні савецкіх законаў, пастаянна выхоўваць у сабе павагу да правілаў сацыялістычнага супольніцтва, добрасумленна выконваць свае абавязкі.

**Падпалкоўнік міліцыі**
**В. МАТУСЕВІЧ,**
**намеснік начальніка АВІР УУС Мінгарвыканкома.**

ПРАБЛЕМЫ ПАТРЭБНА ВЫРАШАЦЬ

# «Гаўдэамус»

**Не кожная ВНУ рэспублікі мае ў сваім распараджэнні маладзёжнае кафэ. Іменна сваё кафэ, дзе гаспадаром становішча і памяшкання з'яўляюцца студэнты.**

КАФЭ «ГАЎДЭАМУС» пачало сваю працу ў 1980 годзе. Трэба заўважыць, што ў той час ішла даволі жорсткая канкурэнцыя паміж ВІА і дыскатэкай. Але энтузіясты даказалі перспектыўнасць новай формы, і з 1982 года ў саставе дыскаклуба «Гаўдэамус» тры студэнты з радыёфізічнага факультэта. А ў 1984 годзе, калі зусім адмовіліся ад ВІА, дыскаклуб папоўніўся яшчэ трыма членамі, і ў тым жа годзе паспяхова прайшоў гарадскую атэстацыю. Вопыт і час дазволілі ўмацаваць тэхнічную базу дыскаклуба, яго колькасны састаў, якасць праграм. Кафэ перастала быць стратным, а стала даваць прыбытак, акупляць сябе.

Узрастала і папулярнасць кафэ. Яго гасцямі былі студэнты ўсіх вучэбных устаноў горада, супрацоўнікі кафедраў універсітэта, маладыя вучоныя АН БССР, курсанты ВІЗРВ і ВШ МУС БССР, спартсмены, замежнікі.

Асноўныя напрамкі работы дыскаклуба: інфармацыйна-пацяшальныя праграмы, тэматычныя, тэатралізаваныя. Мэта ўсіх гэтых праграм — паўнакроўны адпачынак моладзі, папулярызацыя савецкай, лепшай замежнай і эстрады сацыялістычных краін, прывіццё моладзі добрага музычнага густу. Трэба адзначыць, што практычна ўсе ўдзельнікі дыскаклуба — студэнты і выпускнікі факультэта радыёфізікі: М. Калпакоў, Я. Дауд, В. Какарэка і аўтар гэтых радкоў. Гэтыя абставіны прыводзяць да таго, што шмат увагі надаецца тэхнічнаму боку праграм. Мы імкнёмся быць пастаянна ў пошуку новага.

Хачу сказаць некалькі слоў у адрас камітэта камсамола універсітэта, які даволі часта за масавымі мерапрыемствамі, сустрэчамі не бачыў праблем кафэ, не ўнікаў у сутнасць справы, прапаноўваў непрымальныя рашэнні, уносіў дэзарганізацыю ў парадак работы. Нярэдка была няўпраўка ў дзейнасці АКАД. Дзяжурствы зрываліся, праводзіліся на нізкім узроўні.

Цэлы год кафэ было на рамонце. Вельмі хутка яно зноў расчыніць свае дзверы. Нам вельмі б хацелася, каб праграмы былі цікавымі, актуальнымі, больш тэатралізаванымі, каб працавалі секцыі пры кафэ, каб адміністрацыя універсітэта нарэшце вырашыла пытанне з новай мэбляй, каб у кафэ з'явіліся відэамагнітафоны (а рэальныя перадумовы для гэтага ёсць). І яшчэ, каб у кафэ і дыскаклуба з'явілася многа новых сяброў. Чакаем вас!

**У. МОТУЗАЎ,**
**кіраўнік дыскаклуба «Гаўдэамус».**

БЕЛАРУСКІ УНІВЕРСІТЭТ

Мінская паліграфічная фабрыка «Чырвоная зорка» МВПА імя Я. Коласа.
6 лістапада 1986 г.
АТ 07629. Зак. 1377.

*220080, Мінск-80, УНІВЕРСІТЭЦКІ ГАРАДОК, ВУЛ. БАБРУЙСКАЯ, 9, ПАВЕРХ 4, ПАКОІ 72-73. ТЭЛЕФОН 20-68-27.*

Рэдактар
В. П. ВАРАБ'ЕЎ.